**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Калектарная, 10, 220004, г. Мінск
Тэл./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ул. Коллекторная, 10, 220004, г. Минск
Тел./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

25.02.2014 № 06-14/36

На № ____________________

Ухналёву П.В., Нечай Д.Ю.,
Палегенькай Н.У. і іншым
заснавальнікам
Грамадскага аб'яднання
«Сучасны погляд»

Аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі
грамадскага аб'яднання

Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь разгледжаны дакументы аб дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага аб'яднання «Сучасны погляд».

Умовы стварэння і дзейнасці грамадскага аб'яднання, парадак дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання і разгляду дакументаў, прадстаўляемых для яго дзяржаўнай рэгістрацыі, устаноўлены артыкуламі 8, 13 і 14 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях».

Згодна з часткай першай артыкула 8 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях» у якасці заснавальнікаў грамадскага аб'яднання маюць права выступаць грамадзяне, якія дасягнулі васемнаццацігадовага ўзросту, за выключэннем маладзёжных і дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў, заснавальнікамі якіх могуць выступаць грамадзяне, якія дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту.

Вывучэнне прадстаўленых для дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання дакументаў паказала, што рашэнне аб стварэнні Грамадскага аб'яднання «Сучасны погляд» прынята на ўстаноўчым сходзе, які адбыўся 22.12.2013 года ў г. Мінску.

У якасці аднаго з заснавальнікаў Грамадскага аб'яднання «Сучасны погляд» згодна з прадстаўленым у рэгіструючы орган спісам заснавальнікаў выступіла Селівашко К.А., года нараджэння. Дадзеная асоба на дзень правядзення ўстаноўчага схода (22.12.2013 года) не дасягнула шаснаццацігадовага ўзросту. Гэта сведчыць, што Селівашко К.А. не можа з'яўляцца заснавальнікам дадзенага грамадскага аб'яднання. Такім чынам, парушаны ўмовы стварэння грамадскага аб'яднання, устаноўленыя часткай першай артыкула 8 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях».

Акрамя таго, прадстаўлены спіс заснавальнікаў Грамадскага аб'яднання «Сучасны погляд» не адпавядае патрабаванню абзаца сёмага часткі першай пункта 5 Інструкцыі аб парадку афармлення і разгляду дакументаў, звязаных з дзяржаўнай рэгістрацыяй, ліквідацыяй палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый), зацверджанай пастановай Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2005 № 48, а іменна, прадстаўлены спіс заснавальнікаў уключае звесткі аб Селівашко К.А., якая не можа з'яўляцца заснавальнікам дадзенага грамадскага аб'яднання, а таксама ён не падпісаны кіраўніком грамадскага аб'яднання або іншай асобай, упаўнаважанай на тое ў адпаведнасці са статутам грамадскага аб'яднання.

Такім чынам, заснавальнікамі парушаны парадак стварэння рэспубліканскага грамадскага аб'яднання, а таксама прадстаўлены для яго дзяржанай рэгістрацыі спіс заснавальнікаў Грамадскага аб'яднання «Сучасны погляд», які з'яўляецца не сапраўдным дакументам.

На падставе выкладзенага, кіруючыся абзацам трэцім часткі трэцяй артыкула 14 і абзацамі другім і чацвёртым часткі трэцяй артыкула 15 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях», рашэннем Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 21 лютага 2014 г. у дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага аб'яднання «Сучасны погляд» адмоўлена.

Дадзенае рашэнне можа быць абскарджана ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь на працягу месяца з моманту яго атрымання.

Начальнік упраўлення па пытаннях
некамерцыйных арганізацый А.О.Кірычэнка

06 Какуша 2006195